# Навінкі мастацкай літаратуры



**Давідовіч, С. Ф. Суп з чарапахі** : казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Сяргей Давідовіч ; мал. аўт. – Мінск : Звязда, 2023. – 96 с. : іл.




Казкі лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі Сяргея Давідовіча вучаць спагадлівасці і шчырасці, заклікаюць ставіцца да ўсяго жывога на Зямлі беражліва і адказна.

**Чарняўскі, М. Дзе ўзяць красоўкі для Слана?** : казкі : для дзяцей дашк. і мал. шк. узросту / Мікола Чарняўскі ; маст. Аксана Аракчэева. – Мінск : Звязда, 2023. – 72 с. : іл.




Творы, змешчаныя ў новай кнізе вядомага паэта Міколы Чарняўскага, вызначаюцца не толькі разнастайнай вынаходлівасцю сюжэтаў, але і трапнасцю жыццёвых назіранняў, уключэннем у казачную прастору сучасных рэалій. Яны запрашаюць юных чытачоў у дзівосны і таямнічы свет дзіцячай душы, прыроды, жывога роднага слова. Як і раней, паэт застаецца верны свайму творчаму прынцыпу: кніга — гэта свята для дзяцей.

**Конеў, Я. Ф. Прыгоды дамавічкоў** : казкі : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / Ягор Конеў ; мастак Вікторыя Чарняўская. – Мінск : Звязда, 2023. – 48 с.




Здавён так павялося, што на вёсцы ў кожнаў хаце ёсць дамавік. А ў сяле Зарэчча ў дамку на ўскраіне іх аж двое – дамавічок Шушык і дамавушка Жуля. Руплівы Шушык любіць ва ўсім парадак, а гарэза Жуля любіць, каб заўсёды было весела. Але паміж сабой жывуць у згодзе і разам сочаць за тым, каб людзі ў доме не хварэлі, а свойская жывёла не зазнала гора. Дамавічкі сумесна адважваюць ад дома і яго жыхароў усялякае ліха і злыбяду. Кожная перажытая імі прыгода знаёміць з багатым светам беларускага фальклору і з правіламі разумнага жыцця.

**Валодзька, С. В. Чароўныя чаравічкі** : казачныя апавяданні / Станіслаў Валодзька ; малюнкі Дар'і Юцовай. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2023. – 48 с. : іл.




Вас чакаюць захапляльныя прыгоды, знаёмства з хлопчыкамі і дзяўчынкамі, якія, як і вы, гуляюць, вучацца, займаюцца творчасцю і спортам. А яшчэ яны любяць родную мову, шануюць старэйшых, стараюцца быць смелымі і дружнымі.

**Зарэмба, М. М. Арэхавы Спас ; Паддаўкі** : апавяданні : для дзяцей сярэд. шк. узросту / Міхась Зарэмба ; маст. Святлана Стахоўская. – Мінск : Звязда, 2023. – 48 с. : іл.




У зборнік увайшлі творы Міхася Зарэмбы, якія апавядаюць пра жыццё вясковых хлапчукоў і іх недзіцячыя гульні з «цацкамі», што пакінула вайна, узнімаюць праблемы ўзаемаадносін з равеснікамі, сапраўднага і фальшывага сяброўства дзяцей пасляваеннага пакалення. Апавяданне «Арэхавы Спас» уключана ў спіс твораў для дадатковага чытання вучэбнай праграмы па прадмеце «Беларуская літаратура» для V класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання.

**Чарадзейнае слова** : хрэстаматыя для пазакласнага чытання ў 3-м класе / склад. В. Г. Багуцкі. – Мінск : Беларусь, 2022. – 463 с. – (Кніжная паліца школьніка).




У кнігу ўвайшлі народныя творы, а таксама вершы і апавяданні беларускіх пісьменнікаў.

Рэкамендуецца вучням пачатковых класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання для пазакласнага чытання.

**Мастацкае слова ў прозе** : зборнік твораў для вывучэння ў 11 класе. – Мінск : Беларусь, 2022. – 479 с. – (Школьная бібліятэка).




У зборнік увайшлі творы вядомых беларускіх пісьменнікаў XX—XXI стагоддзяў. Яны вылучаюцца разнастайнай тэматыкай, рознымі па характары літаратурнымі героямі, асаблівасцямі ідэйна-мастацкага зместу і накіраваны на сур’ёзны дыялог з чытачом аб сэнсе жыцця і пошуку свайго месца ў гэтым свеце.

**Рублеўская, Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, маршалка менскага** : раман прыгодніцкі і фантасмагарычны / Людміла Рублеўская. – Мінск : Звязда, 2023. – 368 с. – (Святло мінуўшчыны).




Завяршальны, сёмы, раман авантурнай сагі Людмілы Рублеўскай пра прыгоды шляхціца Пранціша Вырвіча і яго вучонага сябра Баўтрамея Лёдніка зноў перанясе вас захапляльны свет XVIII стагоддзя. Нялёгка даліся доктару Лёдніку апошнія выпрабаванні... Ці зможа амаль зламаны чалавек, які шукае ратунку ў адмаўленні ад усяго зямнога, вярнуцца ў вір палітычных інтрыгаў апошніх гадоў Рэчы Паспалітай? А трэба не толькі ратаваць сваіх блізкіх са зняволення, але і абараняць таямніцу полацкіх сутарэнняў, якую зноў хочуць прыўлашчыць хціўцы.

**Родныя словы :** вершы і паэмы : для дзяцей ст. шк. узросту / склад. С. І. Моўчан. – Мінск : Беларусь, 2023. – 246 с. : іл. – (Кніжная паліца школьніка).




У кнігу ўвайшлі паэтычныя творы класікаў беларускай літаратуры П. Броўкі, У. Дубоўкі, А. Куляшова, якім належыць асаблівая роля ў абнаўленні беларускай лірыкі: як на шляху светапоглядным, духоўным, так і ў кірунку жанрава-стылёвых пошукаў.

Зборнік выдаецца ў адукацыйных мэтах.

**Зборнік апавяданняў для чытання ў VII класе** : для дзяцей сярэд. шк. узросту / уклад. Натальля Шчарбакова. – Мінск : Звязда, 2023. – 112 с. – (Школьная бібліятэка класікі).




Зборнік уключае апавяданні беларускіх пісьменнікаў, якія ўваходзяць у вучэбную праграму па прадмеце "Беларуская літаратура" для VII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання.

**Сліва, М. (Кавалёў М. М.) Птушка шчасця** : аповесці, навелы, мініяцюры / Міхась Сліва. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2023. – 156 с.




Новую кнігу вядомага беларускага пісьменніка Міхася Слівы склалі аповесці, навелы, мініяцюры. Галоўная тэма – каханне, тое вечнае пачуццё, што хвалюе сэрца, высакародзіць душу і робіць жыццё радасным, але часта прыносіць трывогі ды пакуты. Шчыра піша аўтар і аб сяброўстве, аб адказнасці за свае ўчынкі. Гэтым тэмам прысвечаны і творы замежных майстроў прозы, перастворaныя Міхасём Мітрафанавічам па-беларуску.

Займальныя сюжэты, неардынарныя жыццёвыя сітуацыі, шчырыя пачуцці герояў робяць кнігу цікавай, будзяць думкі і эмоцыі чытачоў.

**Баравікова, Р. А. Казачныя аповесці пра міжпланетнага Пажарніка і іншых мамурыкаў** : для сярэд. шк. узросту / Раіса Баравікова ; мастак Марыя Міцкевіч. – Мінск : Звязда, 2021. – 136 с.




Мамурык - з далёкай планеты Мамуры, каго адна знаёмая дзяўчынка пісьменніцы Раісы Баравіковай, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, назвала міжпланетным Пажарнікам, даўно спадабаўся юным чытачам.

Кніга атрымала назву "Казачныя аповесці пра міжпланетнага Пажарніка і іншых мамурыкаў". Але падзеі, апісаныя ў ёй, разгортваюцца не толькі на Мамуры. Мамуры і мамурыкі вельмі ўпадабалі нашу Зямлю, і ў казачных аповесцях дапытлівы чытач знойдзе шмат прыгод гэтых займальных і проста сімпатычных істот у мясцінах, добра знаёмых нам.

Кніга будзе садзейнічаць экалагічнаму выхаванню дзяцей.